# ЧЫРВОНКА

Чырвоная змена

30 САКАВІКА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15950)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Гурт «Чараўніцы»:

# «Кожная з іх на сцэне — каралева»



**У сённяшнім выпуску мы раскажам пра сапраўдных лясных фей, якіх у Беларусі называюць чараўніцамі. Нашы гераіні жывуць на сцэне і лічаць, што ім сапраўды ўласціва пэўная магія. Напрыклад, калі дзяўчаты выходзяць выступаць — спыняецца дождж, а сыходзяць — зноў пачынае ліць. Каб даведацца, у чым жа іх сакрэт, мы сустрэліся з кіраўніком легендарнага гурта «Чараўніцы» Палінай БАЗЫЛЕВАЙ. Яна прыйшла разам з Аленай ЦІЖ — вакалісткай ансамбля. Дзяўчаты падзяліліся з «Чырвонкай. Чырвонай зменай» кур'ёзнымі гісторыямі, расказалі пра традыцыі і прымхі, што пануюць у калектыве, пра мацярынскія клопаты і тыя самыя цуды падчас канцэртаў.**

Гісторыя «Чараўніц» пачалася з 1971 года, калі ў гродзенскім ДК тэкстыльнага камбіната музыкант і вялікі аматар джаза Генадзь Лятынскі стварыў жаночы калектыў з выпускніц музычных вучылішчаў. Яго слава грымела на ўвесь Савецкі Саюз. Пасля вялікага поспеху ў «Чараўніц» здарыўся доўгі перапынак. Пра былое прызнанне прыходзілася толькі ўспамінаць. Колішняя кіраўніца калектыву Людміла Пасмурцава ўбачыла працяг сваёй справы ў асобе маладой салісткі Магілёўскай філармоніі Паліны Базылевай, якая трапіла ў калектыў ансамбля выпадкова ў 2011 годзе. Пайшла з мужам на вяселле знаёмых, там праспявала, і — Паліну заўважылі. А ў 2018 годзе дзякуючы дзяўчыне ансамбль пачаў новае жыццё.

«Век артысткі-вакалісткі не такі доўгі, — канстатуе Паліна. — Сцэна патрабуе маладых і амбіцыйных. Таму, калі старэйшыя за нас удзельніцы прынялі рашэнне завяршыць кар'еру, у 2018 годзе мы аб'явілі кастынг. Да нас прыйшла Анжаліка Зайцава, дарэчы, маці чацвярых дзяцей, а паўтара года таму ў склад увайшла Алена Ціж, таксама шматдзетная маці. Мы шукалі сапрана, а ў яе такі званочак — тое, што нам і трэба было» *(смяецца)*.

Раней, расказвае кіраўнік легендарнага гурта, каб трапіць у «Чараўніцы», трэба было адпавядаць тром крытэрыям: праспяваць актаўны скачок на песню «Не за вочы чорныя», не мець шырокую косць і пяць гадоў не нараджаць. Цяпер такіх правілаў няма. Напрыклад, тое, што Анжаліка — мама чацвярых дзетак, кіраўніка калектыву ніколькі не спалохала, наадварот, натхніла. Паліна за тое, каб у кожнага былі і дзеці, і сям'я, так меркавала калісьці і Людміла Пасмурцава. Яна часта падтрымлівала дзяўчат, падстрахоўвала і нават заставалася з іх дзецьмі падчас гастроляў.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Лакацыі актыўнасці

# «КАМАНДА БУДУЧЫНІ»

### Маладзёжных лідараў дапамагае выхоўваць унікальны праект

**Больш як 160 чалавек складаюць кадравы рэзерв, які ўдалося сфарміраваць за час рэалізацыі нацыянальнага праекта «Лідарская платформа «Каманда будучыні». Яго ідэя ўпершыню была агучана Маладзёжным парламентам пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь з трыбуны VI Усебеларускага народнага сходу. А першы набор адбыўся восенню 2021 года.**

— У назве нашага праекта зашыфраваны сэнс — мы імкнёмся стварыць каманду будучыні, якая будзе ўвесь час папаўняцца і прымнажацца, — расказвае **старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ.** — І тое, што наша ідэя была агучана з самай высокай трыбуны, накладае на нас вялікую адказнасць. Мы не маем права апускаць узнятую планку... У 2022 годзе лідарская платформа «Каманда будучыні» стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу маладзёжных ініцыятыў, а ў 2023 годзе ўключана ў рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні Года міру і стваральнай працы.

Мы кансалідавалі вакол сябе самую актыўную і неабыякавую моладзь. Узрост удзельнікаў праекта — ад 18 да 35 гадоў. Наша мэта — пошук сацыяльна актыўных маладых людзей, навучанне іх тэарэтычным




і практычным навыкам у сферы лідарства і дзяржаўнага кіравання, стварэнне камунікацыйнай пляцоўкі для абмену досведам і распаўсюджвання найлепшых практык.

Адбылося ўжо пяць набораў у праект. Дарэчы, пяты набор атрымаўся самым «дарослым» і, напэўна, самым цікавым у плане жыццёвага і прафесійнага вопыту яго ўдзельнікаў. Старт навучанню ўдзельнікаў пятага набору быў дадзены 11 сакавіка на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Яго арганізатарамі выступаюць Маладзёжны парламент, Цэнтр міжнародных даследаванняў факультэта міжнародных адносін БДУ, маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Рух наперад» і навукова-культурная ўстанова «Еўразійскае Партнёрства».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Свой стыль

# Харызматычная, крэатыўная, разумная і таленавітая

### За званне найлепшай змагаліся 12 студэнтак

**Днямі ў Спартыўна-культурным цэнтры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў было шматлюдна: там праходзіў фінал XXXI Міжнароднага конкурсу прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва — 2022». Арганізатарамі выступілі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Расійскі саюз моладзі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Беларусі і Нацыянальнай школы прыгажосці.**



...Апошнія музычныя рэпетыцыі перад стартам шоу, гледачы, якія паступова запаўняюць трыбуны, і канкурсанткі, што рыхтуюцца да выхаду на сцэну ў грымёрцы... А яшчэ — прыгажосць: яна літаральна лунала ў паветры. Менавіта такая атмасфера і панавала ў зале перад мерапрыемствам...

У фінальным шоу ўзялі ўдзел 12 канкурсантак: па шэсць ад Беларусі і Расіі. Трэба адзначыць, што для гэтага ім прыйшлося прайсці зусім няпросты шлях. Напрыклад, на выхад у паўфінал ад беларускага боку прэтэндавала 370 студэнтак. Адборачныя туры адбыліся ў 44 установах вышэйшай адукацыі, паўфіналы — у пяці абласных цэнтрах і Мінску. Каманда фіналістак была сфарміравана канчаткова пасля рэспубліканскага конкурсу грацыі і таленту «Каралева студэнцтва — 2022».

Пасля канцэптуальнага пралогу «Адлюстраванне сапраўднай каралевы» мы нарэшце ўбачылі саміх канкурсантак. Яны ўпэўнена дэфілiравалі па сцэне ў яркіх кактэйльных сукенках. Але ж проста знешняй прыгажосці недастаткова. Сапраўдная каралева павінна быць харызматычнай, крэатыўнай, разумнай і таленавітай. Менавіта гэтыя якасці і былі патрэбны канкурсанткам, каб годна прадставіць творчы нумар. Адным з самых яркіх стала выступленне Ганны Івановай, студэнткі трэцяга курса факультэта эканомікі і бізнес-кіравання Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Яна выканала народны танец на сучасны манер. Гледачы былі ў захапленні.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*